**Міжнародны** пленэр керамікі «Арт-Жыжаль» гэтым летам прайшоў у трынаццаты раз. Пад кіраўніцтвам нязменнага Валерыя Калтыгіна і з удзелам мастакоў з дзевяці краін, у тым ліку з Францыі і Японіі. Традыцыйна па выніках пленэру была зладжана выстава, спачатку ў Бабруйску, а ў кастрычніку — у Мінску.
Керамістам прапанавалася тэма, прысвечаная сацыяльнай экалогіі: «Чалавек у асяроддзі пражывання».
Нагадаю галоўныя адметнасці «Арт-Жыжаля». Праца керамістаў адбываецца ў палявых умовах, з выкарыстаннем самаробных печак і галоўнае — традыцыйнай тэхналогіі абвару. У гэтым тэхналагічным працэсе важны момант перапыненага абпалу і акунання гарачага вырабу ў спецыяльную мучную боўтанку.
З 2005-га пленэры выконваюць функцыю майстар-класаў для пачаткоўцаў, аднак і вопытным прафесійнікам ёсць з чым эксперыментаваць. Найперш гэта нюансы тэхналогіі, а таксама асаблівасці працы ў палявых умовах. Новым досведам керамічнага летніка ў 2015-м з'явіліся стварэнне так званай «бутэлькавай печкі» ды апрабаванне розных новых тэхналогій.
На выставе «Кераміка ночы» ў галерэі «Універсітэт культуры» адметнасці пленэрнай працы ўвасобіліся з выразнай паўнатой. Праявіліся як плённасць даробку кожнага ўдзельніка, так і маштаб працаў: гэта складаныя шматпрадметныя кампазіцыі ды вялікія па аб'ёме рэчы, што даволі цяжка зрабіць у палявых умовах.
Варта адзначыць: стылістычны дыяпазон таксама разнастайны: ад аб'ектаў, падкрэслена набліжаных да механізмаў прыроднага формаўтварэння, да дэкаратыўнасці і нават апавядальнасці. Аднак на выставах, якія падсумоўваюць працу «Арт-Жыжаль», становіцца відавочна: цягам многіх гадоў і трынаццаці пленэраў нарадзіўся і сталее асобны кірунак развіцця беларускай керамікі.

## «Кераміка ночы»
ў галерэі «Універсітэт культуры»

*Алеся Белявец*



**Святлана Кірылюк. Лодка. Шамот, дымленне, абвар. 2015.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ